

*Віцебская ратуша.*

**ВІ́ЦЕБСКАЯ РА́ТУША**, помнік архітэктуры позняга барока з элементамі класіцызму ў г. Віцебск на Рыначнай пл. Верхняга замка. Пабудавана ў 1775 з каменю на месцы драўлянай ратушы 16 ст. Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак з высокай 4-яруснай вежай у цэнтры з шатром са шпілем у завяршэнні. У 1883 вежа перабудавана ў форме невял. ратонды, устаноўлены гадзіннік і звон. У 1911 да асн. аб'ёму надбудаваны 3-і паверх. Рэстаўрацыйныя работы праводзіліся ў 1913, 1944, 1970—80-я гг., 2002. Сучасны сіметрычны будынак захаваў прамавугольны ў плане асн. аб'ём, які прарэзаны 3-яруснай вежай з барочнымі матывамі раскрапаваных карнізаў. Верхні ярус мае назіральную пляцоўку. З боку гал. фасада — невял. тамбур, які на ўзроўні 3-га паверха завяршаецца трохвугольным франтонам. На 2-м паверсе размешчаны 2 балконы з ажурнай металічнай агароджай. Тарцавыя фасады завершаны трохвугольнымі шчытамі з 2 вокнамі-люкарнамі. Цяпер у будынку размешчаны Віцебскі абл. краязнаўчы музей. В.р. ўнесена ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ